Паважаныя калегі!

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ
МУЗЕЙ “ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС “МІР”

запрашаюць прыняць удзел у І Міжнароднай навуковай канферэнцыі

# АБАРОНЧАЕ ДОЙЛІДСТВА БЕЛАРУСІ: ДА 500-ГОДДЗЯ МІРСКАГА ЗАМКА

**Плануемае праблемнае поле канферэнцыі:**

- Гісторыя Мірскага замка і рэгіёна;
- Гарадзішча, замак, фартэцыя, крэпасць: інжынерная навука і мастацтва ў розныя гістарычныя перыяды;
- Горад у віхурах войн і рэвалюцый;
- Храмавае абарончае дойлідства;
- Эвалюцыя тэхнічных ідэй будаўніцтва і абароны ў святле археалагічных, пісьмовых і выяўленчых крыніц;
- Людзі, зброя, умацаванні;
- Рэстаўрацыя і музеефікацыя гістарычных комплексаў, помнікаў і прадметаў.

Час правядзення канферэнцыі: **10–11 верасня 2026 г.**

**Плануемае месца правядзення канферэнцыі:** г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл., Музей “Замкавы комплекс “Мір”; г. Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да **10 жніўня 2026 г.** на электронную пошту **rogneda_o@mail.ru**.

У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка; яго вучоная ступень і званне; пасада і назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык; назва даклада; кантактны тэлефон і e-mail. Студэнтам, магістрантам і аспірантам разам з заяўкай неабходна даслаць тэзісы даклада (да 2000 знакаў) і водгук навуковага кіраўніка.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да **1 верасня 2026 г.**

**Форма ўдзелу ў канферэнцыі:** вочная, прадугледжана магчымасць выступлення online.

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Патрабаванні да тэкстаў дакладаў: да **15 снежня 2026 г.** у аргкамітэт дасылаецца электронны варыянт не болей за 30 000 знакаў. Спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання апускаюцца.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская.

**Кантакты:** Рагнеда Анатольеўна Аляхновіч, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, тэл. (+375 17) 378-18-95, e-mail: rogneda_o@mail.ru; Ложачнік Ігар Мікалаевіч, Музей “Замкавы комплекс “Мір”, тэл. (+3751596) 36-2-91, e-mail: lin@mirzamak.by.

Трансфер па маршруце Мінск – Мір – Мінск ажыццяўляецца арганізатарамі канферэнцыі, даезд з іншых населеных пунктаў за кошт камандзіруючага боку.

Аргкамітэт